А. Ф. МЯСНІКОЎ

# САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПРАЦОЎНЫХ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ НА СТАРОНКАХ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ДРУКУ

Упершыню працоўнае пагадненне паміж Беларуссю і Літвой на ўзроўні рэспублік было падпісана ў 1973 годзе. Часу прайшло параўнальна нямнога, аднак цяпер практычна няма ніводнай сферы гаспадарчай і культурнай дзейнасці, дзе саперніцтва прадстаўнікоў дзвюх рэспублік не пусціла б свае глыбокія і надзейныя карэнні. Для пацвярджэння гэтага — некалькі лічбаў. У 1973 годзе дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва заключылі 410 прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый, калгасаў, саўгасаў і ўстаноў нашай рэспублікі, 29 міністэрстваў і ведамстваў, 22 гарады і раёны. Сёння ж малюнак наступны: амаль 700 калектываў, 52 міністэрствы і ведамствы і 39 гарадоў і раёнаў плённа сапернічаюць з літоўскімі калегамі.

Працоўны энтузіязм, наватарства і творчасць, якія нараджаюцца ў ходзе гэтага спаборніцтва, знаходзяць шырокае адлюстраванне і распаўсюджванне на старонках беларускіх газет і часопісаў, у перадачах рэспубліканскага тэлебачання і радыёвяшчання. Такім чынам, усё новае, перадавое становіцца здабыткам шырокіх працоўных мас.

Аднак рашэнні XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, снежаньскага (1977) і ліпеньскага (1978) пленумаў ЦК КПСС патрабавалі ад партыйных камітэтаў далейшага развіцця і ўдасканалення сацыялістычнага спаборніцтва. У адказ на гэтую ўстаноўку Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, мясцовыя партыйныя органы вялікую ўвагу сканцэнтравалі і на паглыбленні працоўнага саперніцтва з калектывамі Літоўскай ССР. Асабліва — на такім важным напрамку, як пашырэнне індывідуальнага спаборніцтва паміж працаўнікамі вядучых прафесій у прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама паміж нізавымі звеннямі. І гэта не выпадкова. Менавіта тут выразней можна ўбачыць магчымасці для павышэння і ўдасканалення індывідуальнага прафесіянальнага майстэрства, дакладней акрэсліваюцца тыя непаладкі і недахопы, якія перашкаджаюць паступальнаму руху наперад не толькі таго ці іншага працаўніка, а і цэлага калектыву.

Творчыя калектывы «Звязды», «Советской Белоруссии» і «Сельской газеты» у сваёй штодзённай рабоце надаюць пільную ўвагу індывідуальнаму спаборніцтву беларускіх і літоўскіх працоўных. На старонках газет даволі часта публікуюцца грунтоўныя замалёўкі, карэспандэнцыі і артыкулы, у якіх раскрываецца не толькі так званы механізм арганізацыі саперніцтва сяброў, але і маральныя аспекты яго, уздзеянне на фарміраванне асобы чалавека-працаўніка.

Даўно і шчыра сябруюць памочнік майстра Брэсцкага дывановасуконнага вытворчага аб'яднання А. Кавальчук і яго калега К. Бальчунас з Лентварскай дывановай фабрыкі, што ў Літве. У адным са сваіх нумароў «Советская Белоруссия» і прадаставіла слова перадавіку з горада над Бугам.

«Нярэдка ездзім мы ў госці адзін да аднаго і, як кажуць, не з пустымі рукамі, — піша А. Кавальчук. — Абменьваемся самым каштоўным здабыткам — набытым вопытам. Калі раней, здаралася, толькі па паперах звяралі свае паказчыкі, то цяпер у час рэгулярных сустрэч на практыцы паказваем, як можна лепш выканаць тыя ці іншыя аперацыі, як рацыянальней арганізаваць працу людзей і машын» [1].

Сябруюць і спаборнічаюць не толькі брыгады А. Кавальчука і К. Бальчунаса, а і ткачыхі двух аднатыповых прадпрыемстваў. У 1974 годзе, прыгадвае майстар з Брэста, у Лентварысе праходзіў Усесаюзны конкурс дываноўшчыц. Суддзям, удзельнікам і гледачам конкурсу спадабалася тады выдатная праца і высокае выканаўчае майстэрства Галіны Раманенка з Брэста і Біруты Стасюнайтэ з Лентварыса. Дзяўчаты пасябравалі, заключылі дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва. Неаднойчы пабывалі потым на рабочых месцах адна другой, дасканала вывучылі «сакрэты» работы, арганізацыі працы. Дзевятую і дзесятую пяцігодкі і працаўніцы, і калектывы у цэлым выканалі датэрмінова.

Вельмі характэрным і павучальным з'яўляецца сяброўства вытворчых калектываў Віцебска і Каўнаса. Рэгулярны абмен дэлегацыямі, узаемадапамога ў мантажы і абсталяванні новых вытворчых карпусоў і ліній, актыўнае перайманне перадавога вопыту — гэтыя формы творчай садружнасці даўно сталі добрай традыцыяй. У невялікім па памеры, аднак вельмі змястоўным артыкуле аб гэтым расказаў у «Звяздзе» загадчык прамыслова-транспартнага аддзела Віцебскага гаркома КП Беларусі У. Кічыгін. «Аднымі з першых, — адзначаў аўтар, — устанавілі сяброўскія кантакты тэкстыльшчыкі камбінатаў шаўковых тканін, якія ёсць у абодвух гарадах. Спаборніцтва пачалося 13 гадоў назад. Для яго характэрна канкрэтнасць і дзелавітасць. І каўнаскія, і віцебскія тэкстыльшчыкі імкнуцца прыйсці на дапамогу адзін аднаму ў вырашэнні складаных вытворчых пытанняў. Атрымалі, напрыклад, віцябчане новую высокапрадукцыйную шліхтавальную машыну, а вопытных спецыялістаў для яе запуску не было. Сваімі сіламі арганізаваць наладку — значыць патраціць шмат часу. Звярнуліся да літоўскіх сяброў, для якіх аналагічная тэхніка даўно знаёмая. На камбінат адразу прыехаў вопытны спецыяліст С. Казлаўскас. Ён не толькі хутка і якасна выканаў наладку і запуск шліхтавальнай машыны, але і... навучыў рабоце на ёй...» [2]

Такія сувязі дазваляюць беларускім і літоўскім калегам творча пераймаць і укараняць навінкі навукі і тэхнікі, розныя ўдасканаленні. Параўнальна за невялікі прамежак часу на Віцебскай фабрыцы «КІМ» укаранілі восем мерапрыемстваў, перанятых у працаўнікоў Каўнаса. Эканамічны эфект ад гэтага — 12 тыс. рублёў у год.

Побач з пастаянным развіццём вытворчых кантактаў больш шырокім становіцца і культурны абмен. Традыцыйным стаў і ўдзел прадстаўнікоў гарадоў у правядзенні сходаў партыйна-гаспадарчага актыву, злётаў пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, навукова-практычных канферэнцый і г. д. На іх сапернікі разам аналізуюць вытворчыя дасягненні, выяўляюць недахопы ў арганізацыі вытворчасці, бытавога абслугоўвання, адпачынку працоўных.

Нямала сумесных намаганняў, пошукаў нявыкарыстаных рэзерваў і магчымасцей праяўляюць у ходзе міжрэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва сельскія працаўнікі Беларусі і Літвы. Два раёны — Астравецкі Гродзенскай вобласці і Швянчонскі Літоўскай ССР — суседзі. Жыхары іх з даўніх часоў звязаны вузамі вялікай дружбы. Вяскоўцы спаборнічаюць паміж сабой за эфектыўнае развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці. Найбольшую цікаўнасць уяўляе супрацоўніцтва калгасаў «Радзіма» і «Кратуоніс». Асабліва баявым стала іх спаборніцтва ў гонар XXVI з'езда КПСС. «Сельская газета» прысвяціла адлюстраванню хода гэтага саперніцтва цыкл публікацый. «Цяжка сказаць сёння, — адзначала газета ў першым артыкуле, — які з двух — перадавых у сваіх раёнах — калгасаў лепшы. У кожнага ёсць свае перавагі, свая перспектыва. Аднак у пастаянных зносінах калектывы атрымліваюць шмат карыснага для сябе. Нездарма ж кажуць: калі ў двух чалавек ёсць па адной добрай ідэі, то, абмяняўшыся, кожны з іх будзе валодаць дзвюма. У гэтым і заключаецца сутнасць адной з выдатных граняў сацыялістычнага спаборніцтва паміж «Радзімай» і «Кратуонісам» [3].

Так, пастаянныя зносіны сяброў-сапернікаў з'ядноўваюць братнія народы, умацоўваюць іх інтэрнацыяналісцкую свядомасць. Здавалася, «Сельская газета» знайшла «сваю» тэму — расказваць аб перадз'ездаўскай працоўнай вахце суседзяў. На жаль, наступная публікацыя з гэтага цыкла з'явілася на старонках газеты... праз пяць месяцаў. Ва ўрэзцы да артыкула гаварылася, што прысвечаны ён аднаму з маральных аспектаў спаборніцтва — выхаванню чалавека, аднак тэма засталася не раскрытай, «засакрэчанай». Ды і чытачы, відаць, ужо забыліся, што гэта — адзін з артыкулаў цыкла, задуманага рэдакцыйным калектывам [4].

Між іншым, на нашу думку, іменна для «Сельской газеты» у рабоце па прапагандзе сацыялістычнага спаборніцтва дзвюх братніх рэспублік ёсць вельмі шырокае кола пытанняў, нявырашаных праблем. Калі тыя ж астравецкія і швянчонскія працаўнікі вёскі маюць пастаянных партнёраў, з якімі і вядуць абмен перадавым вопытам, то ва ўсіх іншых гаспадарках нашай рэспублікі здабыткі суседзяў яшчэ не знаходзяць шырокага прымянення.

Работнікі беларускіх гаспадарак з ахвотай пазнаёміліся б з каштоўным вопытам на старонках перыядычных выданняў, і ў прыватнасці «Сельской газеты».

Прынцыпова новым напрамкам творчага саперніцтва працоўных Беларусі і Літвы стала спаборніцтва калектываў навуковых устаноў. У нашай краіне навука пераўтварылася ў непасрэдную вытворчую сілу. Таму ў працоўных пагадненнях, якія заключаюць паміж сабой галіновыя інстытуты Акадэміі навук БССР і Акадэміі навук Літоўскай ССР, асабліва пільная ўвага звяртаецца на тое, як навуковыя распрацоўкі і адкрыцці ўкараняюцца ў вытворчасць, які эканамічны эфект даюць яны народнай гаспадарцы дзвюх рэспублік. У 1974 годзе паміж вучонымі было заключана дзесяць дагавораў аб сацыялістычным спаборніцтве. А ўжо праз чатыры гады — у 1978-м — такіх пагадненняў стала дваццаць. Шырока пачалі практыкавацца сумесныя даследаванні беларускіх і літоўскіх вучоных у самых розных галінах народнай гаспадаркі. Кіруюць гэтым супрацоўніцтвам, каардынуюць сумесную дзейнасць вучоных партыйныя камітэты акадэмій.

Сацыялістычнае спаборніцтва акадэмій Беларусі і Літвы, адзначаў у артыкуле «Мацнеюць сувязі вучоных» намеснік старшыні аб'яднанага камітэта прафсаюза АН БССР С. Некрашэвіч, «стала важным стымулам павышэння эфектыўнасці і якасці даследаванняў, дзе магчымасць шырока карыстацца вынікамі сумесных пошукаў, дабратворна ўплывае на ўсю творчую атмасферу навуковых устаноў. ...Намаганні вучоных былі сканцэнтраваны на выкананні плана творчага супрацоўніцтва акадэмій, якім прадугледжана правядзенне комплексных і сумесных навукова-даследчых работ больш чым па 30 важнейшых праблемах і тэмах, укараненне вынікаў даследаванняў у народную гаспадарку, падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў, сумеснае выкарыстанне эксперыментальнай базы і лабараторнага абсталявання, а таксама правядзенне экспедыцый, навуковатэхнічных і культурна-масавых мерапрыемстваў» [5].

Паспяхова і плённа супрацоўнічаюць увесь гэты час калектывы Інстытута механікі металапалімерных сістэм АН БССР і Інстытута фізікатэхнічных праблем энергетыкі АН Літоўскай ССР. Свае намаганні вучоныя накіравалі на даследаванне і глыбокае вывучэнне палімерных і кампазіцыйных матэрыялаў, пакрыццяў на аснове іх. Беларусы вырабілі і перадалі сваім літоўскім калегам устаноўку для атрымання палімерных пакрыццяў, аказалі ім дапамогу ў мантажы яе, адладцы вытворчага працэсу. Для больш поўнага і шырокага азнаямлення са сваімі распрацоўкамі даследчыкі арганізавалі ў літоўскім інстытуце спецыяльную выстаўку. У сваю чаргу ў Інстытуце механікі металапалімерных сістэм Акадэміі навук Беларусі шырокае прымяненне знайшоў метад дыфузнай стабілізацыі палімераў для павелічэння працаздольнасці палімерных і металапалімерных вырабаў, які распрацаваны ў Інстытуце фізіка-тэхнічных праблем энергетыкі АН Літвы.

Міжрэспубліканскае сацыялістычнае спаборніцтва паміж навуковымі ўстановамі Беларусі і Літвы ўпэўнена ідзе па шляху паглыблення і ўдасканалення. І, думаецца, правільна зробяць рэдакцыйныя калектывы «Звязды», «Советской Белоруссии» і «Сельской газеты», калі будуць часцей друкаваць на старонках газет дзелавыя артыкулы і карэспандэнцыі, прысвечаныя прапагандзе і шырокай папулярызацыі творчага супрацоўніцтва вучоных дзвюх братніх рэспублік.

«Цяпер на прадпрыемствах і будоўлях, у калгасах і саўгасах, арганізацыях і ўстановах рэспублікі, як і ўсёй краіны, шырыцца барацьба за ажыццяўленне велічных прадвызначэнняў XXVI з'езда КПСС, — адзначыў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі Ціхан Якаўлевіч Кісялёў пры падпісанні дагавора аб сацыялістычным спаборніцтве працоўных Беларускай і Літоўскай рэспублік на 1981 год. — Мы цвёрда ўпэўнены ў тым, што паспяховаму вырашэнню пастаўленых партыяй задач будзе садзейнічаць далейшае развіццё і паглыбленне, павышэнне дзейснасці сацыялістычнага

спаборніцтва паміж Беларускай і Літоўскай Савецкімі Сацыялістычнымі Рэспублікамі»[6]. У спаборнічаючых дзвюх братніх рэспубліках адзіныя мэты і імкненні ў жыцці — дасягненне новых поспехаў у эканамічным і сацыяльным развіцці, ва ўмацаванні вялікага, непарушнага адзінства і дружбы савецкага народа. Задача друку — шырока і рознабакова прапагандаваць здабыткі суседзяў, услаўляць іх натхнёную творчую працу, выяўляць недахопы і ўсяляк садзейнічаць іх выпраўленню.

[1] Советская Белоруссия, 1976, 1 января.
[2] Звязда, 1979, 28 ліпеня.
[3] Сельская газета, 1980, 14 августа.
[4] Гл.: Сельская газета, 1981, 18 января.
[5] Звязда, 1979, 18 сакавіка.
[6] Звязда, 1981, 21 сакавіка.

О. Г. СЛУКА

## В. И. ЛЕНИН И РАЗВИТИЕ ПРОПАГАНДЫ СРЕДИ МОЛОДЕЖИ

Активную агитационно-пропагандистскую работу в массах молодежи В. И. Ленин считал важнейшей задачей партии. Печать, специальные молодежные издания должны были выполнять задачи политического образования молодежи, сближения ее с пролетариатом и вовлечения в активную революционную борьбу.

Проблемы революционного воспитания молодежи были сформулированы В. И. Лениным в статье «Задачи революционной молодежи», напечатанной в газете «Студент» в 1903 году. В статье говорилось, что редакции газеты не следует ограничиваться только студенческими интересами, надо стремиться разобраться в сущности борьбы российского пролетариата, вступившего на путь «...массового, организованного движения под руководством социал-демократии, под знаменем программы, которая уже давно стала программой всего международного сознательного пролетариата» [1].

В. И. Ленин выдвигает свою программу идейного объединения студенчества. «Не ясно ли само собой, — указывает он, — что о революционизировании студенчества можно говорить только с точки зрения вполне определенного взгляда на содержание и характер этого революционизирования? Для социал-демократа, например, оно означает, во-первых, распространение социал-демократических убеждений среди студенчества и борьбу с теми взглядами, которые хотя и называются «социалистически-революционными», но с революционным социализмом не имеют ничего общего, а во-вторых, стремление расширить, сделать более сознательным и более решительным всякое демократическое, а в том числе и академическое движение в студенчестве» [2]. Основная задача газеты — распространять идеи социал-демократии, критикуя практику «ложных друзей», которые отвлекали молодежь от революционной борьбы.

В постскриптуме к статье, высказывая свое желание и в дальнейшем сотрудничать со «Студентом», Ленин указывает на проблемы, которые подлежали обсуждению на страницах газеты и фактически могли стать программой ее деятельности. Это — пропаганда марксизма для выработки мировоззрения молодежи, задач социал-демократической партии, молодежных организаций и их отношения к пролетарскому движению [3].

В. И. Ленин сотрудничал и в других молодежных изданиях с целью вовлечь молодежь в сознательную борьбу против самодержавия под руководством марксистской партии. Его статья «Рабочая партия и ее задачи при современном положении» была опубликована в газете «Молодая Россия», которая вышла 4 января 1906 года как орган студентов социал-демократов. Авторами «Молодой России», кроме В. И. Ленина, были М. Ольминский, А. Гапеев, А. Замятин, М. Горький.

В. И. Ленин настоятельно советовал своим соратникам как можно шире вовлекать молодежь в революционную борьбу. В письме в Петербургский боевой комитет в революционные дни 1905 года он писал: «Идите к молодежи, господа! вот одно единственное, всеспасающее средство. Иначе, ей-богу, вы опоздаете (я это по всему вижу) и окажетесь с «учеными» записками, планами, чертежами, схемами, великолепными рецептами, но без организации, без живого дела. Идите к молодежи» [4].